# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

10 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15910)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Вольга ЯКАВІШАНА:

# «ТАНЦА МНЕ ЗАЎСЁДЫ МАЛА»

**Штодзённыя рэпетыцыі, яркія касцюмы, пастаянныя гастролі і, вядома ж, любоў публікі — менавіта такі графік жыцця гарманічны для нашай сённяшняй гераіні. Яна ўжо шмат гадоў працуе салісткай Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» і сёння падзеліцца з намі ўсімі сакрэтамі закулісся.**



***— Як вы прыйшлі ў ансамбль?***

— Знаёмства з «Харошкамі» адбылося яшчэ ў самым дзяцінстве. Калі была маленькай дзяўчынкай, мяне вельмі прыцягвалі народны танец і музыка. Я тады ўжо зразумела, што менавіта з гэтымі відамі творчасці хачу звязаць сваё жыццё. Убачыўшы маё жаданне і патэнцыял, мама запісала ў студыю пры ансамблі. У адзінаццаць гадоў я пачала там займацца. Шчыра кажучы, трапіць туды было не так ужо і проста. Для паступлення ў студыю мы здавалі экзамены: народны і класічны танец. Але нават калі вы скончылі яе, гэта не давала гарантыі аказацца ў «Харошках». Нашымі выкладчыкамі ў студыі былі высокаадукаваныя харэографы з багатым артыстычным досведам. Яны па-сапраўднаму зараджалі нас сваімі талентам і імкненнем, мэтанакіравана навучалі любіць народны танец, а найлепшых выпускнікоў запрашалі ў калектыў. Калі ты старанна працуеш, горача жадаеш, і да гэтага дадаецца кропелька шанцавання... І вось ты ўжо артыст «Харошак»!

***— Цяжка было ўліцца ў калектыў?***

— У студыі я атрымала добрую прафесійную падрыхтоўку, без якой, на мой погляд, нельга стаць майстрам сваёй справы. Але ўсё адно напачатку было крыху не па сабе. У галаве ўвесь час круцілася, што мяне ўзялі на выпрабавальны тэрмін, і, нават прапрацаваўшы год у калектыве, я ўсё роўна часам думала, што мяне яшчэ правяраюць (*смяецца*).

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Тэорыя поспеху

# Інструкцыя па выкарыстанні самога сябе

### Чаму пры самавызначэнні не варта марнаваць час на дасягненне чужых мэт?

**Як сумясціць у будучай прафесіі чытанне кніг і кіберспорт і ці можна гэта зрабіць? Такое нечаканае пытанне прагучала ад юнага ўдзельніка сустрэчы, што прайшла ў рамках Тыдня прафесійнай адукацыі. На працягу сямі дзён эксперты расказвалі школьнікам на рэальных прыкладах, што дае чалавеку прафесійная адукацыя, якія магчымасці адкрываюцца перад выпускнікамі каледжаў і ліцэяў, дзе можна працаваць і павышаць сваю кваліфікацыю пасля заканчэння сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай навучальнай установы і як можа быць арганізавана інклюзіўнае адукацыйнае асяроддзе.**

**Далучыўшыся да Тыдня прафесійнай адукацыі анлайн, усе ахвотныя змаглі пабываць на віртуальных экскурсіях па каледжах і ліцэях Мінска, Оршы, Гродна і Маладзечна, а таксама ўбачыць, як працуюць самыя сучасныя беларускія прадпрыемствы. Усе мерапрыемствы прайшлі ў рамках праекта «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі» і былі прымеркаваны да старту ўступнай кампаніі 2021 года. Праект фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізоўваецца ў партнёрстве з міністэрствамі адукацыі, працы і сацыяльнай абароны і РІПА.**



### АД ЮНГІ — ДА КАПІТАНА

«Прафесійная адукацыя: новая рэальнасць і старыя ўяўленні» — так была сфармулявана тэма сустрэчы, падчас якой сваімі гісторыямі поспеху падзяліліся з падлеткамі прадстаўнікі самых розных прафесій.

Адзін з іх — **Ілья ПРОХАРАЎ, прадпрымальнік, саўладальнік крафтавай пякарні і кавярні Bro Bakery,** расказаў, як выбіраў прафесію ў школьныя гады.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

У ліку найлепшых

# УДАЛЫ КАДАР

## або Фота як першы крок да прафесіі

**Сёлета на факультэце журналістыкі БДУ ўпершыню прайшлі рэспубліканскі фотаконкурс для школьнікаў, а таксама рэспубліканскі конкурс юных карэспандэнтаў. Яны былі прымеркаваны да 100-годдзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аднымі з найлепшых у іх аказаліся вучаніцы слонімскай сярэдняй школы № 8 Мілена СМАГІНА, а таксама маладзечанскай сярэдняй школы № 11 Ангеліна САРОКА.**



**Фотаработа «Маё натхненне» Мілены Смагінай.**

— Мая цікавасць да фатаграфіі ўзнікла яшчэ ў дзяцінстве, але прафесійна займаюся ёю на працягу двух гадоў, — кажа 16-гадовая Мілена, — з тых часоў, як бацькі падарылі мне доўгачаканы фотаапарат. У асноўным здымаю партрэты і прыроду. Таксама вельмі падабаецца макраздымка (здымка раслін або насякомых з павелічальнай лінзай). Мая мама прапанавала паўдзельнічаць у конкурсе, бо яна ведае, наколькі я люблю фатаграфаваць. Творчае спаборніцтва праводзілася ў два этапы. Свае работы можна было дасылаць па трох намінацыях: «Прырода», «Людзі» і «Нязведаная Беларусь». Я абрала другую. Здымак, які адпраўляла, атрымаўся спантанна. Памятаю, у той дзень мне прыйшла доўгачаканая пасылка з новым аб'ектывам. Як толькі ён апынуўся ў мяне, мы з малодшай сястрой пабеглі на вуліцу зрабіць пару пробных кадраў. Ёй вельмі падабаецца фатаграфавацца, а мне, зразумела, патрабуецца практыка. Так і атрымаўся здымак, які я назвала «Маё натхненне». Калі дасылала яго на конкурс, не была ўпэўнена, што стану адным з пераможцаў.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*